**Nr. 3 „Biełaruskaj Krynicy“ skanfiskawany.**

Pierasyłka apłačana ryčałtam

**Nr. 4 (645).** **Wilnia, Piatnica 24 Studzienia 1936 h.** **Hod XII (XX)**

# БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

| Adras Redakcyi i Administracyi:<br>WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1).<br>Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč. | HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ. | Košty wydawańnia pakrywajuć składki.<br>Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał.,<br>na 3 miesiacy — 1 zał. |
|---|---|---|

# За родную школу!

## Заклік Бел. Нацыянальнага Камітэту ў Вільні.

Прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, на сваім паседжаньні дня 22.I.1936 г., разглядзеўшы сучаснае народна-асьветнае палажэньне Беларусаў у граніцах Польскай дзяржавы, а так-жа прааналізаваўшы рэфэрат Куратара Віленскага Школьнага Вокругу аб народнай асьвеце ў нашым Краю, які быў прачытаны на сабраньні паслоў і сэнатараў у Вільні, а пасьля дня 26.XI.1935 г. апублікаваны ў прэсе, — сьцьвярджае, што:

1) для больш як 2.500.000 Беларусаў у Польскай дзяржаве толькі 69 школаў, у якіх, як цьвердзіць Куратар, „узята пад увагу беларуская мова," — гэта станоўча мала і гэтым патрэба народнай асьветы Беларускага народу ня вырашана;

2) цьверджаньне Школьнага Куратара аб недахопе ў Беларусаў народнай сьведамасьці а праз гэта і пажаданьня школы ў роднай мове не згаджаецца з фактамі: — Беларусы ад 1926 да 1930 г. падалі польскім школьным уладам дэкляраცыяў больш як на 412 беларускіх школаў;

3) Беларусы заўсяды і цяпер адчуваюць патрэбу роднай школы і яе рознымі спосабамі дамагаюцца.

Дзеля вышэйсказанага, а так-жа бяручы пад увагу неабходнасьць навучаньня дзяцей у роднай мове, Прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага Камітэту гэтым заклікае беларускія арганізацыі і ўсё сьведамае беларускае грамадзянства ў сёлетнім 1936 годзе правесьці школьны плебісцыт — арганізавана памагчы беларускім сялянам і работнікам падаць польскім школьным уладам дэклярацыі за беларускую школу.

*ПРЭЗЫДЫЮМ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАМІТЭТУ:*

(—) *Я. Пазьняк* старшыня, (—) *Інж. Л. Дубейкаўскі* I віцэ-старшыня, (—) *Міф. М. Шкелёнак* II віцэ-старшыня

(—) *Інж. А. Клімовіч* скарбнік, (—) *Ул. Казлоўскі* сэкратар.

# „Ludowy Front“ u Polščy

### Adziny biełaruski front i jaho raźbiwalniki.

Biełaruski adradženski ruch u Zach. Biełarusi maje charaktar nacyjanalna-socyjalny. Biełaruskaje sialanstwa, katoraje stanowić absalutnuju bolšaść u našym narodzie, nia znaje partyjnaha padziełu — heta ŭ bolšaści małaziamielnyja i biezziamielnyja ziemlaroby.

Nastroi hetaj biełaruskaj masy reprezentujuć biełaruskija arhanizacyi abjadnanyja ŭ adziny biełaruski front pad nazowam — Biełaruski Nacyjanalny Kamitet.

Hety biełaruski narodny front dawoli silny i wytrywały — ŭsie dasiulešnija ataki na jaho byli biazsilnymi. Treba skazać adnak, što ataki nakirawanyja na raźbiwańnie hetaha adzinaha biełaruskaha frontu nia byli biełaruskaha pachodžańnia i ŭsie jany mieli pačatak swoj ad dziejnikaŭ warożych da biełarusaŭ.

Hety adziny front arhanizawanych Biełarusaŭ pad Polščaj abjednywaje

úsich narodna dumajučych biełarusaŭ — sialan, rabotnikaŭ i intelihientaŭ.

Nie źmiaščajucca-ž u hetym froncie, abo suproć jaho wystupajuć tolki tyja biełarusy, na katorych dziejuć upływy wonkawaha charaktaru. Hetyja raźbiwalniki wystupali suproć adzinaha frontu biełarusaŭ daŭniej, raźbiwajuć jany biełaruskuju pracu i ciapier — raźbiwajuć adziny front biełaruskich paetaŭ i piśmieńnikaŭ...

*p—k.*

## Pa Niomanie...

Jak-by wužaka, ujecca Nioman pa našaj ziamielcy. Ja lublu jeździć pa im ad Horadni tudy ŭharu, hdzie Łunna i Masty. Padarož heta adbywajecca na parachodzie „Jagiełło“. Ja radžu choć kamu prajechacca pa biełaruskim Niomanie. U Niomanie wada čystaja, jak ślaza biełarusa. U im, jak u lustry, adbiwajucca jahonyja bierahi. Byccam žywyja, tolki što dahary, u Niomanie ja baču duby, jasieni, klany i biarozki. Tam i siam pa bierahoch abapał stajać biełaruskija chatki. Dawoli husta i adważna na horcy ci ŭ łažku raskinulisia staryja biełaruskija wioski. Miła hladzieć na hety krajabraz Niomanaŭ. Zdajecca, sieŭ-by ja na henym bierazie Niomana i pisaŭ by biespierastanku ab minułych i sučasnych biełaruskich padziejach. Nia dziŭna, što wialikija ludzi ab Niomanie niamała pisali. Pra Nioman pisała Oźeškowa, Adam Mickiewič, Jakub Kołas, Żyłunowič i inš.

Woś-ža jedziem.

„Jagiełło“ až uhinajecca ad pasažyraŭ. Stary, jon zasopsia, burčyć, kašlaje i złujecca, zadychajecca i ledź daciahnuŭ da henaha miesca, hdzie raka Świsłač abnimajecca z Niomanam. Na złość usim tut „Jagiełło“ adpačywać uziaŭsia. Na jaho pabiełarusku kryčyć „kapitan“, ale jon i henaha „kapitana“ nia słuchaje. Na mieli staŭ i niama rady. Dobryja dźwie hadziny prajšli, pakul jaho skirawali ŭ hłybiejšyja wody.

U časie prymusowaha adpačynku zahawaryli ludzi na „Jagielle“, dy hawaryli jany ŭsiečysta pabiełarusku. Sam „kapitan“ i to kamandu dawaŭ pabiełarusku. Z pad Łunny, z Mastoŭ, z pad Słonima, z nad Ščary jechali biełarusy. Hetyja našy ludzi, honar i sława im, uporysta hawaryli tut pabiełarusku. Padatkniecca da ich chto z polščynaj, dyk jany jaho abdarajuć zimnym niedawieram. Adrazu jany tady maŭčać, trymajucca tolki siabie i swajho jazyka. A jak daŭžej chto im z hetym dakučaje, tady jany tolki machorku swaju kurać, dy plujuć na wody Niomana.

W. D—a.

## З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

**З арганізацыйнага жыцьця БХД.** На іншым месцы сяньняшняй „Бел. Крыніцы“ шырэй апісана справа разгону паліцыяй сходу Рады БХД, які быў скліканы на мінулую нядзелю 19 студня сёлета. Дзень прад тым, знача 18 студня сёлета прыгатаваўчыя нарады да сходу Рады БХД веў Цэнтральны Камітэт БХД, які між многімі іншымі арганізацыйнымі справамі апрацаваў аканчальна праект праграмы і статуту БХД. Праект праграмы ў аканчальнай рэдакцыі ЦК-БХД зьмяшчаем у гэтым нумары „Бел. Крыніцы“, праект-жа статуту адкладаем да нумару наступнага. З друкаванага ў гэтым нумары праекту праграмы бачым, што і Цэнтр. Камітэт БХД стаў на тым становішчы, каб абноўленая арганізацыя называлася „Беларускае Народнае Аб‘яднаньне — Б.Н.А.“

**Як трэба разумець закон?** На мінулую нядзелю 19-га студня сёл. Віленскі Аддзел БІГіК арганізаваў публічную лекцыю на тэму „Пачаткі гісторыі Беларусі“. Па лекцыі меліся быць харавыя беларускія песьні і дэклямацыі выбраных твораў беларускіх паэтаў. На пададзенае ў гэтай справе паведамленьне ў Віленскае Гарадзкое Староства — як заўсёды дагэтуль, а нават аплачанае гэрбавымі маркамі, чаго дагэтуль не вымагалася — ў дзень прад лекцыяй прыйшоў з названага староства адказ адмоўны. На інтэрвэнцыю ў адпаведных уладаў быў дадзены адказ, што праўная асоба (знача — Інстытут) склікаць публічна сход (лекцыю) ня можа і павінна арганізаваць яго асоба фізычная. Улады паклікаюцца пры гэтым на арт. 5 закону аб сходах з дн. 11.III.32 г.

Ня месца тут спрачацца, як трэба разумець успомнены пункт закону аб сходах. Паведамляем тут толькі, што гэту самую лекцыю, з тымі-ж вокальнымі дадаткамі, у тэй-жа залі Інстытуту пры Завальнай вул. 1—1 ладзіць у наступную нядзелю 26 І.36 г. асоба фізычная (прыватная) — інж. А. Клімовіч. Пачатак а гадз. 17-ай. Уход вольны і бясплатны.

**Ёлачка для беларускіх дзетак.** 12-га г. м. дзякуючы стараньню рэдакцыі час. „Пралескі“ і групы віленскіх бацькоў-беларусаў была сарганізавана ў залі Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў Вільні ёлачка для беларускіх дзетак. На гэтую каляднюю дзіцячую імпрэзу прыйшло больш 30 ці дзяцей, а так-жа й бацькі. Ёлачка адбылася вельмі ўрачыста і ў дужа прыемнай атмасфэры. Спачатку дзеткі гулялі, сьпявалі, ігралі, дэклямавалі беларускія вершы, палілі сьвечкі і прыглядаліся да розных цацкаў, а пасьля ўважна слухалі беларускіх калядак, каторыя прыгожа сьпяваў хор БІГіК. На заканчэньне закладчык „Пралесак“ а. др. Ст. Глякоўскі і грам-ка М. Пазьнячыха раздалі дзецям падаркі. Адбылася пры тым супольная фатаграфія.

Пажадана, каб такія і падобныя імпрэзы для беларускіх дзетак адбываліся часьцей, і ня толькі ў Вільні, але і на правінцыі, ды каб яны былі арганізаваны крыху шырэй, г. зн. каб маглі на іх прыходзіць дзеці шырэйшых беларускіх кругоў.

**Падзяка.** Бел. Інстытут Гасп. і Культ. дзякуе грам. Пятру Бодаку за прысланую ў музэй Інстытуту вартасную старадаўную манэту, а д-ру Я. Малецкаму за 7 паштовых значкоў (у тым ліку тры беларускія значкі).

**Паседжаньне Прэзыдыюму Беларускага Нацыянальнага К-ту.** 22 г. м. адбылося паседжаньне Прэзыдыюму Бел. Нац. К-ту, на якім разглядалася справа беларускага школьніцтва ў Зах. Беларусі і пастаноўлена заклікаць культурна-асьветныя арганізацыі і ўсё грамадзянства да падаваньня школьным уладам дэклярацьыяў за беларускую школу. У гэтай справе пастаноўлена выдаць асобны заклік, які зьмяшчаем на іншым месцы нашай газэты.

**Прапазыцыя утраквізацыі Беларускага Музэю ў Вільні.** Даведваемся, што Віленскае „Т-ва Пшыяцюл Наук“ запрапанавала „Беларускаму Навуковаму Т-ву“ перанясеньне і злучэньне Беларускага Музэю з гістарычнымі зборамі „Т-ва Пшыяцюл Наук.“ Цікава, як пастáвіцца ў гэтай справе „Беларускае Навуковае Т-ва.“

**Канфіскаты.** У мінулым тыдні адміністрацыйныя ўлады сканфіскавалі № 1 (2) газэты „Наша Воля“ і № 1 (16) „Новы Шлях.“

*Складайцеся на адзіны ў Зах. Беларусі квартальны літаратурна-навуковы журнал „Калосьсе“. Складка на адну кніжку найменш 1 зл. — Кніжка 5-я „Калосься“ (першая ў гэтым годзе) ўжо ў друку. — Прысылайце дзеля друку матарыялы, адпаведныя характару журналу!*

*Адрас рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная 1—2.*

*Грошы перасылаць найлепш г. зв. разрахунковым пераказам, які можна купіць на кожнай пошце (1 грош за экзэмпляр).*

## Palityka S.S.R.R.

### Z pramowy Mołatawa.

Staršynia rady narodnych kamisaraŭ Mołataŭ dnia 11 h. m. wystupiŭ u CIK z pramowaj ab mižnarodnaj palitycy Sawietaŭ, u jakoj miž inšym zajawiŭ:

S.S.R.R. choča supakoju — sawieckija adnosiny z druhimi dziaržawami raźwiwajucca narmalna i zroblena ŭsio mahčymaje dziela supakoju ŭ Eŭropie i ŭ Azii.

Dziela zakrapleńnia eŭrapejska-ŭschodniaha supakoju zaklučany sawiecka-francuski, a tak ža i sawiecka-čechasławacki dahawor.

Adnosiny Sawietaŭ z Anhlijaj zusim dobryja i jość nadzieja, što jany na horšyja nia źmieniacca.

Suadnosiny S.S R.R. z Zł. Štatami Ameryki raźwiwajucca ahułam narmalna, asabliwa ŭ halinie haspadarčaj, nie zważajučy na častyja wystupleńni amerykanskaj presy suproć zbliženńia S.S.R.R. z Amerykaj.

Nieparazumieńnie Sawietaŭ z Uruhwajem pieradana na razhlad u Lihu Nar.

Sawiety majuć dobruju wolu naładzić lepšyja suadnosiny z Niamieččynaj, ale suproć hetaha staić ciapierašni niamiecki ŭrad, jaki pasiahaje na S.S R.R.

Adnosiny Japonii da S.S.R.R. padazronyja — japonski ŭrad dyplamatyčna adkazwajecca zaklučyć z sawieckim uradam dahawor ab nienapadańni; japonska-mandžurskija addzieły wojska wielmi časta napadajuć na sawieckuju pahraničnuju stražu i hetak prawakujuć narušeńnie mirnych suadnosinaŭ.

U kancy Mołataŭ adznačyŭ, što byccam zaklučany wajenny dahawor miž Japonijaj, Niamieččynaj i maje z hetym dahaworam suwiaź Polšč. Dahawor škirawany prociŭ S.S.R.R.

Mołataŭ adznačaŭ, što italijanska-abisynskaja wajna moža wyklikać wajnu i ŭ Eŭropie, dyk Sawiety buduć zbroicca, kab byŭ mir...

## „Azija dla azijataŭ“

Japonija kinuła klič „Azija dla azijataŭ“ i konsekwentna da hetaj mety jdzie. Nadowiačy była ŭ Londanie h. zw. „morskaja narada“ pradstaŭnikoŭ „morskich“ dziaržaŭ, jakaja mieła radzić ab ahraničeńni zbrajeńnia na mory. Narada hetaja nie adbyłasia, bo jaje sarwała Japonija, jakaja ad hetaj narady adkazałasia.

Ab što tut idzie?

Japonija choča mieć swabodu zbrajeńnia na mory, suproć čaho stajać Anhlija i Ameryka.

Anhlija i Ameryka majuć swaje intaresy ŭ Kitaju. Jaho starajecca padparadkawać sabie Japonija i wycisnuć adtul upływy eŭrapejskija i amerykanskija. Dziela hetaha Japonija zbroicca i nia choča paddacca ahraničeńniu zbrajeńnia.

# Праект праграмы Беларускага Народнага Аб‘еднаньня

### I. Галоўныя палітычна-грамадзкія мэты.

§1. a) Б.Н.А., стоячы на прынцыпе самастанаўленьня народаў, імкнецца да самастойнасьці Беларускага Народу на ўсіх яго этнографічных землях, аб‘яднаных у незалежную дзяржаву;

b) Б.Н.А. імкнецца да таго, каб у незалежнай Беларусі быў створаны такі грамадзкі лад, які, апіраючыся на працы, грамадзкай роўнасьці і справядлівасьці, не дапускаючы да эксплёатацыі адных другімі, заспакойваў-бы палітычна-грамадзкія, культурныя і эканамічныя патрэбы грамадзян;

c) Б.Н.А. проціў усякай дыктатуры, як капіталізму, фашызму, камунізму і інш.

### II. Шлях да мэтаў.

§ 2. Б.Н.А. да сваіх мэтаў ідзе:

a) дарогай арганізаваньня, усьведамляньня беларускага сялянства, работнікаў і інтэлігенцыі на грунце грамадзкай роўнасьці, справядлівасьці і беларускай народнай культуры. Дзеля гэтага Б.Н.А. вядзе палітычную працу, арганізуе і памагае арганізаваць прафэсыянальныя саюзы, закладае беларускія школы, народныя дамы, ладзіць лекцыі, рэфэраты, курсы, зьезды, выдае кніжкі, газэты і г. д.

b) Б.Н.А. праводзіць сваю дзейнасьць так-жа на грунце палітычна-грамадзкіх установаў, выкарыстываючы тыя варункі, у якіх жыве Беларускі Народ,

c) Б.Н.А. урэшце, ідучы да сваіх мэтаў, змагаецца так-жа ўсімі іншымі магчымымі дастойнымі спосабамі.

### III. Адносіны да суседніх і іншых народаў.

§ 3. Б.Н.А. лічыць сваім ідэалам, каб Беларускі Народ меў добрыя адносіны з усімі народамі на падставе ўзаемнасьці, роўнасьці і міжнароднай справядлівасьці.

### IV. Палітычныя і грамадзкія правы.

§ 4. Б.Н.А. за роўныя правы для ўсіх грамадзян.

§ 5. Б.Н.А. за свабоду сходаў, друку, слова, сумленьня, арганізацыі таварystваў і прафэсыянальных саюзаў.

§ 6. Б Н.А. дамагаецца поўнай свабоды выбараў у дзяржаўныя і самаўрадавыя ўстановы на падставе агульнага, простага, тайнага, роўнага і прапарцыянальнага галасаваньня.

§ 7. Кожная нацыянальнасьць мае права карыстацца сваей мовай у агульна-грамадзкім і палітычным жыцьці.

### V. Самаўрады.

§ 8. Б.Н.А. стаіць за тое, каб грамадзкія культурныя і гаспадарскія справы мясцовага характару належалі да тэрыторыяльных, гаспадарскіх і прафэсыянальных самаўрадаў.

### VI. Школа.

§ 9. Б.Н.А. за дэмократызацыю асьветы. Дзеля гэтага асьвета агульна-падставовая — абавязкавая для ўсіх і на кошт дзяржавы або самаўраду.

§ 10. Навучаньне можа адбывацца так-жа прыватна на кошт уласны грамадзян.

§ 11. Навука ў школах павінна адбывацца ў роднай бацькаўскай мове дзяцей.

§ 12. Школы прыватныя карыстаюцца такімі-ж правамі, як і дзяржаўныя.

§ 13. Б.Н.А. за пашырэньне школ земляробскіх, тэхнічных і агулам прафэсыянальных.

§ 14. Б Н.А. за права і вольнасьць шырокай прасьветнай працы пазашкольнай (прасьветныя арганізацыі, чытальні, бібліятэкі, тэатр, народныя дамы, народныя унівэрсытэты і інш.).

§ 15 БНА за тое, каб закладаючы бурсы і інтэрнаты, а такжа вызначаючы стыпэндыі на кошт дзяржавы й самаўрадаў, дапамагаць дзецям сялян і работнікаў здабываць сярэднюю й вышэйшую асьвету.

### VII. Рэлігія.

§ 16. Б.Н.А. за свабоду існаваньня рэлігіі і дзейнасьці рэлігійных установаў і за свабоду вызнаваньня рэлігіі.

§ 17. Б.Н.А. за тое, каб рэлігійныя ўстановы, у сваей рэлігійнай працы, як у сьвятынях, школах і інш., карысталіся роднай мовай сваіх верных.

§ 18. Б.Н.А. проціў выкарыстываньня рэлігіі палітыкай.

### VIII. Справа ўласнасьці.

§ 19. Грамадзкі парадак Беларускага Народу агулам павінен апірацца на прынцыпе прыватнай уласнасьці.

§ 20. Прыватная аднак уласнасьць павінна так быць ўрэгулявана і абстаўлена законам, каб ня была шкоднай агульна-грамадзкаму дабру.

§ 21. Побач уласнасьці прыватнай можа быць так-жа і ўласнасьць супольная (прыватна-грамадзкая, дзяржаўная), дзе гэтага хочуць людзі і дзе гэтага вымагае агульна-грамадзкае дабро.

# Z pramowy ministra ŭnutranych spraŭ ab pałažeńni ŭ Polščy

Na pasiedžańni sojmawaj budžetnaj kamisii ministr unutranych spraŭ Račkiewič dnia 20 h. m. skazaŭ pramowu, z jakoj pradstaŭlajecca pałažeńnie biaśpiečnaści ŭ Polščy hetak:

Pałažeńnie biaśpiečnaści wa ŭsiej dziaržawie ŭ minułym hodzie pahoršyłasia. Uzrasło ahulnaje prastupstwa. Uzrasło ŭ hetym časie tak-ža prastupstwa pawažnaha charaktaru: dziaržaŭnaj zdrady, bandyckich napadaŭ, napadaŭ paasobnych.

Pamnožylisia tak-ža wypadki buntaŭ i supraćstaŭleńniaŭ uładzie. Uzrasła dziejnaść nielehalnaja — kolportaž nielehalnych drukaŭ, adbywańnie nielehalnych sabrańniaŭ i lik masawych wystupleńniaŭ. Uzrasła tak-ža dziejnaść arhanizacyjaŭ rewalucyjnych i terorystyčnych, asabliwa na ŭschodnich „kresach".

# Polskaja zahraničnaja palityka

U sojmawaj Kamisii zahraničnych spraŭ ministr Bek 14 h. m. wystupiŭ z ekspoze ab polskaj zahraničnaj palitycy, jakaja pradstaŭlajecca hetak:

Polšč u italijanskaj wajnie nie zacikaŭlena i ŭtrymliwaje dobryja adnosiny z Italijaj, a tak-ža nie zajmaje stanowišča prociŭ Anhlii.

Polskaja palityka trymajecca paktu Lihi Narodaŭ datul, pakul bolšaść dziaržaŭ prytrymliwajecca hetaha paktu. Polšč nia moža pajści na asłableńnie Lihi Narodaŭ, jakaja źjaŭlajecca centram mižnarodnaha supracoŭnictwa.

Paśla zaklučeńnia dahaworu ab nienapadańni z Sawietami, Polšč zaklučyŭšy dahawor z Niamieččynaj ukraplaje mir miž Zachadam i SSRR.

Litwa nie padtrymliwaje z Polščaj dobrasusiedzkich adnosinaŭ, a Čechasławaččyna praśleduje ŭ siabie palakoŭ.

# Liha Narodaŭ

U paniadziełak 20 h. m. pačałasia 90-taja sesija Rady Lihi Narodaŭ. Na hetaj sesii buduć razhladacca biahučyja sprawy apošnich padziejaŭ u mižnarodnym žyćci. Na paradku dnia, miž inšymi, staić sprawa sawiecka-uruhwajskaha incydentu, sprawa Hdansku i sprawa italijanska abisynskaj wajny.

### Hutarki i pratesty.

Z nahody adčynieńnia sesii Rady Lihi Narodaŭ u Ženewie, aprača hutarak aficyjalnych, adbywajucca tam ciapier usiakija hutarki nie aficyjalnyja, matarjał da jakich źbirajecca adusiul. Hetym razam palityki ŭ Ženeŭskich restaranach buduć mieć što hawaryć i ab našych ziemlach, bo, jak dawiedwajemsia, Wilenski polski Pratestacyjny Kamitet, jaki kirawaŭ niadzielašniaj (19 h.m.) demonstracyjaj u našym Kraju, wysłaŭ polskamu ministru zahraničnych spraŭ pałk. Beku ŭ Ženewu telehramu, prosiačy hetak ministra, kab jon uziaŭ pad uwahu hetuju sprawu i naležna joj pakirawaŭ. Telehramu padpisali: staršynia hienerał Mikałaj Osikowski, siabry: b. ministr Aleksander Meyštowič, Ad. Babianski i inž. Glatman.

**Armija Lihi Narodaŭ.** Paśla taho, jak Liha Narodaŭ akazałasia biazsilnaj, kab zabaranić wajnu Japonii proci Kitaju (Mandžuryi) i Italii proci Abisynii, znajšlisia prajektadaŭcy sarhanizawańnia mižnarodnaj armii, jakaja zaležyła-b biespasredna ad Lihi Narodaŭ i wykonywała-b jejnyja zahady. — Hetki prajekt padaje ŭ londynskim „Times" (čas) lord Doze.

**Sumnaja statystyka.** Pawodle statystyčnych abličeńniaŭ biura Lihi Narodaŭ, u 1934 h. na całymświecie z hoładu i niedastatku pamiarło 2.400 000 asob, samahubstwam-ža z niedastatku sposabaŭ da žyćcia končyła 1.200.000 duš.

**Z Abisynskaha frontu.** Abisynija zmušana baranicca ad italijancaŭ na dwuch frontach: na poŭnačy i na paŭdni. Z pačatkam Nowaha Hodu Abisyncy ažywili swaju dziejnaść na froncie paŭnočnym, adbirajučy nazad tyja abšary, z jakich spačatku wajny biaz boju adstupili, dy zdabywajučy wialikija zapasy zbroi i prawijantu. Italijancy pry hetym staralisia wykarystać swaje aeraplany, ale zrabili heta nieŭpapad, bo zamiest abisynskaha wojska, pačali absypać bombami placoŭki mižnarodnaha Čyrwonaha Kryža, čym u kancy sami sabie zaškodzili.

Za apošni tydzień pačałosia ažyŭleńnie i na paŭdzionnym froncie, ale tut užo pierawažna z boku italijancaŭ, jakim i ŭdałosia tymčasam adsunuć abisyncaŭ u hory. Kamandzier abisyncaŭ na hetym froncie Ras Desta zajawiŭ, što jon adsunuŭsia ŭ hory tamu, što atrymaŭ nakaz ad negusa aščadžać siły i nia źwiazwacca ŭ boj ŭ adkrytym terenie wyhodnym dla italijancaŭ i niawyhodnym dla abisyncaŭ.

## Z WILNI.

**Kanfiskata.** „Przegl. Wil." Nr. 1—2 skanfiskawany za dwa artykuły: „Recydywa" i „Co dalej?". Administracyjnyja ŭłady ŭ hetych artykułach uhledzili niepraŭdziwyja wiestki.

# Пісьмы з вёскі

### За родную газэту.

Чэраўкі, каля Кабыльніка, Прыпадкова папала ў нашую вёску газэта „Беларуская Крыніца," з якой даведваемся аб жыцьці Беларусаў і аб галоўных падзеях у сьвеце. Зацікавіліся нашыя сяляне роднай газэтай і некаторыя пастанавілі мець „Бел. Крыніцу" заўсяды — паслалі ў рэдакцыю пісьмо і папрасілі прысылаць газэту.

У нас ёсьць польская школа, пры якой сарганізаваны г. зв. „зэспул тэатральны." Гэты „зэспул" ладзіць прадстаўленьні, ведама, польскія і выпісвае для нашай моладзі польскія газэты. Моладзь нашая лепш цікавіцца беларускімі газэтамі, чымся польскімі.— Як паявіцца ў вёску беларуская газэта або кніжка, дык зыходзяцца хлопцы ў адно мейсца і супольна чытаюць.

Падаючы аб вышэйапісаным у рэдакцыю, просім паясьніць, як пісаць у газэту весткі з нашай старонкі і як залажыць сваю, беларускую бібліятэку.

*Маладыя Беларусы.*

АД РЭДАКЦЫІ: у газэту пішэце аб праявах жыцьця грамадзкага, культурнага, народнага і агулам аб усім, што мае характар агульны, народны, палітычны. Выпішце з кнігарні кніжкі і будзе бібліатэка. Залажэце гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры і ладзьце свае, беларускія прадстаўленьні.

### Дамаганьне беларускай газэты.

Пачапава, Наваградзкі пав. У 1934 г. у лютым я паслаў складку на „Бел. Крыніцу" 4 зл. і атрымаў прэмію з кніжак, за каторыя я і ўся нашая моладзь дзякуем выдавецтву „Бел. Крыніцы." З пачатку году газэта „Б. Кр." прыходзіла да нас у вёску акуратна, пасьля пачала прыходзіць неакуратна, а ў канцы і перастала. Хто тут вінават, ня ведама, пошта ці адміністрацыя? Дзеля гэтага зьвяртаю ўвагу адміністрацыі, каб газэту высылала акуратна і праўджала, ці пошта даручае. Пры гэтым мушу адзначыць, што гэнга мая заўвага ня ёсьць маёй асабістай, але гэта просьба мясцовых людзей, якія зацікаўленыя беларускай газэтай — „Бел. Крыніцай" і незалежніцкім кірункам. Гэтая газэта нясе ў нашую вёску сьвятло, пачуцьцё народнае і дэмаскуе прадажнікаў беларускай справы, якія наступаюць на нашую моладзь.

*Ятраўскі.*

АД РЭДАКЦЫІ: Усім нашым чытачом газэту высылаем акуратна.

# Roznyja wiestki

## Z POLŠČY

**Pawodka administracyjnych štrafaŭ.** Pawodle padličeńniaŭ Hałoŭnaha Statystyčnaha Biura za čas ad 1.X.1934 h. da 30.IX.1935 h. u całaj Polščy było nałožana 1.102.765 administracyjnych štrafaŭ. Na kožnych 10.000 nasielnictwa prypadaje ŭ siarednim 329 štrafaŭ. U sud śkirawana było 3.2 prac. usich spraŭ.

**Uznoŭ štrajki ŭ promyśle.** Apošnim časam u łodzkim promyśle ŭznoŭ pačalisia štrajki. Pryčynaj štrajkaŭ jošć pahroza astanoŭki niekatorych fabryk, a tak-ža namiečanaja abnižka rabotnickich zarabotkaŭ.

## Z ZAHRANICY

**Adstaŭka kabinetu Lawala ŭ Francyi.** Paśla taho, jak čatyry radykalnyja ministry kabinetu Lawala padalisia ŭ adstaŭku, dnia 22 h. m. padaŭsia ŭ adstaŭku i cełу kabinet. Dymisyjanawanyja ministry wykonwajuć swaje abawiazki da času ŭkompletawańnia kabinetu nowaha.

**Śmierć anhielskaha karala Juraha V.** Unočy z 20 na 21 h. m. pamior anhielski karol Jury V. Niabožčyk u minułym 1935 h. uračysta światkawaŭ 25 uhodki swajho panawańnia. Karaleŭski tron Brytyjskaj Imperyi zaniaŭ najstarejšy syn niabožčyka prync Uelski, pryjmajučy imia Edwarda 8-ha.

### IX. Зямля.

§ 22. Зямля і ўсе прыродныя багацьці на Беларусі, на падставе прыроднага права, зьяўляюцца ўласнасьцяй Беларускага Народу.

§ 23. Валаданьне і карыстаньне зямлёй на Беларусі павінна быць апёрта на падставе права ўласнасьці (глядзі § 19).

§ 24. Прыватная зямельная ўласнасьць павінна быць урэгулявана так, каб ня шкодзіла агульна-грамадзкаму дабру (глядзі § 20).

§ 25. Вобак прыватных зямельных гаспадарак могуць існаваць і гаспадаркі колектыўныя, дзе гэтага хочуць людзі, а так-жа дзе гэтага вымагае агульна-грамадзкае дабро (гл. § 21).

§ 26. Найбольш адпаведнай формай прыватнай зямельнай гаспадаркі Б.Н.А. уважае гаспадарча-самавыстарчальныя хутары.

§ 27. Хутары павінны мець зямлі ня больш такой нормы, якой хапае на дастатнае выжыўленьне і культурнае ўтрыманьне сялянскай сям'і.

§ 28. Беззямельныя і малазямельныя сяляне зямлю атрымоўваюць бяз выкупу.

§ 29. Разрахунак за зямлю з ўласьнікамі праводзіць дзяржава.

§ 30. Арганізаваньне зямельных гаспадарак, а так-жа азначаньне колькасьці зямлі і варункаў яе атрыманьня праводзіцца адпаведнымі органамі, у паразуменьні з тымі, каторых гэта беспасрэдна датыча.

§ 31. Б.Н.А. імкнецца да пашырэньня і павялічэньня зямельна-гаспадарскай культуры.

§ 32. Б.Н.А. за справядлівыя цэны на прадукты сялянскія і фабрычныя: проціў выкарыстываньня вёскі местам і наадварот.

§ 33. Б.Н.А. проціў чужога асадніцтва на беларускіх землях.

### X. Справы работніцкія.

§ 34. Для работнікаў фабрычных Б.Н.А. бароніць:

a) васьмі-гадзінны дзень працы,

b) права страйку, як абарону ад вызыскаў, і права праф-саюзаў,

c) калектыўныя ўмовы, дзеля забясьпечаньня лепшай аплаты,

d) забарону начной працы (вынятак там, дзе вымагаюць тэхнічныя варункі або грамадзкія патрэбы),

e) забарону працы шкоднай здароўю жанчыны,

f) забарону працы дзяцям у фабрыках, неадпаведную іх веку,

g) нядзельны адпачынак.

§ 35. Б.Н.А. за праўную апеку над працоўнымі на зямлі, у фабрыках і над хатняй службай адумысловым уставадаўствам.

§ 36. Б.Н.А. бароніць усе дасюлешнія соцыяльныя і прафэсыянальныя здабычы работнікаў, а так-жа змагаецца за іх пашырэньне і далейшае разьвіцьцё.

### XI. Адносіны між сялянствам, работнікамі і інтэлігенцыяй.

§ 37. Б.Н.А. за салідарнасьць сялян, работнікаў і інтэлігенцыі і ўсіх працоўных.

§ 38. Б.Н.А. проціў дыктатуры работнікаў над сялянамі і наадварот.

§ 39. Б.Н.А. імкнецца да таго, каб не пролетарызаваць грамадзян, але надзяляць іх уласнасьцяй: сялянскіх работнікаў надзяляць зямлёй, а фабрычных рабіць супольнікамі прадпрыемства. Б.Н.А. імкнецца да таго, каб і фабрычных работнікаў надзяляць зямлёй, дзе-б яны маглі мець прынамся гарод і пабудаваць сабе хату.

### XII. Ахова здароў'я і грамадзкая апека.

§ 40. Б.Н.А. за грамадзкую ахову здароў'я грамадзян.

§ 41. Б.Н.А. за соцыяльную ахову над інвалідамі і сіротамі.

### XIII. Коопэрацыя.

§ 42. Б.Н.А. за пашырэньне спажывецкай, вытворчай, гандлёвай, крэдытнай і інш. коопэрацыі (коопэратыўныя крамы, малачарні, аляярні, льнярні, пазычкова-ашчадніцкія касы, коопэратывы здароўя і г. д.) і за поўную свабоду ейнага разьвіцьця.

### XIV. Падаткі.

§ 43. Мерай падаткаў павінен быць даход. Дзеля гэтага, хто больш мае даходу, той прагрэсыўна больш плаціць і падатку. Сяляне плацяць залежна ад колькасьці і катэгорыі зямлі, а гараджане—ад сваей маемасьці. Катэгорыю зямлі ўстанаўляюць сялянскія камісіі пры самаўрадах, а ацэнку маемасьці ў гарадох — такія-ж камісіі складзеныя з гараджан.

§ 44. Б.Н.А. проціў падаткаў пасрэдных (укосных) на прадукты першай патрэбы, як на соль, газу, цукар і інш.

§ 45. Б.Н.А. за адзіны падатак, гэта знача за такі, які-б вызначаўся раз у год, з разлажэньнем на раты і з азначэньнем тэрміну.

§ 46. Даход патрэбны толькі на пражыцьцё павінен быць ад падаткаў зусім звольнены.

### XV. Суд.

§ 47. Суд павінен быць незалежны ад палітычных кірункаў і ад адміністрацыі.

§ 48. Ува ўсіх важнейшых крымінальных і палітычных справах прыгавары пастанаўляюцца судамі прысяжных.

§ 49. Б.Н.А. проціў кары сьмерці.

### XVI. Войска.

§ 50. Б.Н.А. змагаецца з палітыкай мілітарызму і ймкнецца да замены сталай арміі народнай міліцыяй.

Дамагайцеся газэты на пошце і калі пошта вінавата, пішыце ў Дырэкцыю Пошты скаргу. Кантроль даручэньня газэты з пошты хутчэй належа да самога падпішчыка, як да адміністрацыі часапісу.

### Вясковыя падзеі.

Лядкі, Стаўпецкага пав. Дабра няма ў нашай ваколіцы—надта многа йшчэ ёсьць „дзікіх" людзей. У нас ёсьць „Пажарная Стража" і гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры. Надовячы „Стража" ладзіла польскае прадстаўленьне — ставілі безсэнсовую сцэну „Вырозумялы Комісаж." На гэтае прадстаўленьне зайшлі і некаторыя сябры Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры. Пасьля прадстаўленьня пачалася бойка — „дзікуны" напалі на сяброў гуртка Інстытуту, якія змушаныя былі бараніцца фізычнай сілай і абараніліся.

Другое здарэньне было гэткае: У нашай вёсцы адбыўся сход дзеля перавыбараў управы „Пажарнай Стражы." На сход прыбыў паветавы інструктар, які загадаў выключыць з „Пажарнай Стражы" тых асоб, што належаць да гуртка Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры Такім чынам з нашай „Пажарнай Стражы" выключаны і начальнік гэтай стражы, бо ён зьяўляецца так-жа сябрам Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры.

*Влад.*

### Народная сьведамасьць шырыцца.

Стахоўцы, Пастаўскага пав. У нашай вёсцы народная сьведамасьць шырыцца. Прыходзіць 9 экзэмпляроў розных беларускіх газэт у вёску, а моладзь і старэйшыя ахвотна іх чытаюць. Чытаюць нашыя людзі і беларускія кніжкі. Гэтак жывуць духовым жыцьцём сьведамыя людзі. Нясьведамыя жывуць у цемнаце — нічога яны ня чытаюць і нічым, апрача дэнатуркі, ня цікавяцца.

Летась 8 верасьня, як па ўсей Польшчы, былі выбары — галасаваньне ў нас адбылося ў Занарачы, за 3 вярсты ад нашай вёскі. Сьведамыя беларусы ведалі, што нашых кандыдатаў у Сойм і Сэнат ня было, дык і галасаваць не хадзілі, хадзілі галасаваць нацыянальна нясьведамыя сяляне і аддавалі свае галасы за расейца Пімагава.

Нашыя сяляне крыху абмаскоўленыя і па сваей цемнаце некаторыя трымаюцца расейшчыны, якая ў нашай вёсцы ёсьць сымбалям цемнаты. Сьвятлейшыя людзі—гэта нацыянальна сьведамыя беларусы.

Тут трэба адзначыць, што сымбаль цемнаты ў нашай вёсцы зьнікае, людзі прасьвячаюцца і народна ўсьведамляюцца.

*Ів. Хоц.*

### Ciarplać i hoład i choład.

Wioska Brančany, Biełastockaha pawietu. Brančany sływuć tut uwa ūsiej akolicy. Jany družny narod. Hrudźmi stajać adzin za druhoha. Začapić hdzie brančanca, to za jaho ūsia wioska biarecca i tamu ad ich ciažka abaranicca. Zatoje, peūna, i heta wioska nazwałasia Brančanami. U Brančanach biełaruskaja świedamaść nia duža wialikaja, ale bolšaja jana, čym napr. u Pamihačach. Brančancy ūžo takuju biełaruskuju naturu majuć, što wialikich ceremonijaū jany z nikim nia robiać. Prad nikim jany nie nadymajucca, jak taja prad wałom žaba. Jany duža naturalnyja biełarusy. Jak lepiej, jak lahčej, tak jany i haworać. Žywuć tut ludzi z pracy ruk. Ziamli ū ich pa zahončyku. Tak i siak paraskidanyja ū wioscy chatki. Druhija wioski z brančancaū padśmiejwajuć, byccam jany duža prostyja ludzi. Tut u wajnu było maleńkaje zdareńnie. Biaz chleba haładawali ludzi. Niechta z Brančan na poli z jamy dastaū čužuju bulbu. Kradziež hena nia była ū toj čas kradziežaj, ale heta i siahońnia brančancam prypaminajuć.

Ahułam u Biełastockim kutočku ludzi i ich žyćcio pakazywajucca nam duža cikawymi. Na čaławiečka hladziš ty, a jon niespačeśnieńki. Ale zakrani ty jaho, to jon pabiełarusku jak raźwiadziecca — jošć čaho słuchać. Tutaka zaūważajecca nadta jaskrawy pierachod z mowy biełaruskaj na polskuju i naadwarot taksama. Toj samy čaławiek hawora i pabiełarusku i papolsku, ale ty wuchu swajmu nia wieryš. Bo jak mianiaje jon swaju mowu, to ty, mima woli, na jaho hlanieš, kab upeūnicca, što heta čaławiek toj samy. Tut ludzi takija, što ū chacie jon jeść adnu bulbačku, a ludziam pakazywaje, što jon jeść chleb. Umiejuć ciarpieć tut ludzi i hoład i choład, ale maūčać i ciarpiać.

B.

### Baranić swajo prawa treba.

Juchnawiec (kala Biełastoku) pierad kaladami byū u žałobie, pamior ich probaršč.

Heta čysta biełaruskaja parachwija. Jana z polskimi probarščami nia moža dawać sabie rady. Juchnawieckija parachwijanie wyrazna sabie i druhim kažuć: „Wot, kab nam probaršča, što ūmieje hawaryć pa našamu!" Ale ū Biełastoččynie musić nia skora dačakacca nam biełaruskich probarščaū, bo, jak my čujem, tam dalej i to ad ludziej paadbirali swaich probarščaū. U susiedztwie z nami ū Tryčoūcy raz byū biełaruski probaršč. My tudy chadzili hladzieć biełaruskich paradkaū u kaściele i nam jany padabalisia, my hena i ciapier pomnim.

Oj, jak biełarusam katalikom treba stojka baranić swajo prawa! Bo-ž i maładyja i staryja ksiandzy na Biełarusi nadta mocna kryūdziać swaich biełaruskich awiečak. Jany psujuć biełaruskuju naturu i zabiwajuć u ich biełaruski duch. Hetak robicca nia tolki ū Juchnoūcy, ale i šyrej pa Zachodniaj Biełarusi.

J.

### Z našaj staronki.

Patrebičy, Świancianskaha paw. Kala nas žywuć pierawažna biełarusy, pa wiery ūsie kataliki. Apošnimi hadami žyćcio ū našaj staroncy wielmi pahoršyłasia—haspadarčy kryzys mocna prycisnuū sialan.

Narodnaja biełaruskaja świedamaść siarod našych sialan pašyrajecca, asabliwa siarod moładzi, jakaja čytaje biełaruskija hazety i knižki. Našaja moładź ładzić biełaruskija pradstaūleńni — 14 XI.1935 h. ū w. Dubnikach, pad kiraūnictwam Edwarda Kareckaha, adyhrana była kamedyja „Ščaśliwy muž". U wioscy Damucioch, Łyntupskaj wołaści, było anahdaj pradstaūleńnie, na jakim adyhrana pabiełarusku kamedyja „Michałka". Ludzi biełaruskimi pradstaūleńniami nadta cikawiacca.

Adnym słowam świedamaść narodnaja ū nas jość i heta ūžo ūsiudy widać. Nam patrebnaja swaja, biełaruskaja arhanizacyja. U polskija arhanizacyi našaja moładź nia maje achwoty iści.

Dyk arhanizujmasia i praświačajmasia.

J. P.

### Kulturnaja praca.

Aksiutawa, Brasłaūskaha paw. Dzień 12 studzienia siol. u našaj wioscy byū niazwyčajny — u hety dzień našyja sialanie pačuli sa sceny rodnuju biełaruskuju mowu i pieśniu. U nas niama biełaruskaj arhanizacyi. Jość u nas polskaje „Koła Młodzieży Wiejskiej". Hetaje „koła" zładziła biełaruskaje pradstaūleńnie. Zacikaūleńnie i radaść ludziej trudna apisać — na scenie pradstaūlali kamedyju „Źbiantežany Saūka", a na zali byū ščyry śmiech da śloz. Narodu było šmat — mnohija pryjaždžali z dalokich wiosak na biełaruskaje pradstaūleńnie. Pradstaūlali tak-ža i patryjatyčnuju scenu „Pieršyja łastaūki".

Treba wiedać, što henaje pradstaūleńnie ładziła moładź, što naležyć da „Koła młodzieży wiejskiej" — aficyjalna polskaj arhanizacyi. Našaja moładź i ū čužych arhanizacyjach narodna ūświedamlajecca i pačynaje pracawać dla dabra biełaruskaj sprawy. Za hetkija pastupki aksiutaūskaj moładzi sława!

Lawon Žalejka.

## Naša pošta

Učaśnik. Dziakujem za wiestku — karystajem.

Raslancu. Atrymali, pieradali staršyni BIHiK. Karystajem.

K. S — č. Drukujem, dziakujem, pišycie ab rabotnickich sprawach čaściej.

Ladki. Karespandencyju atrymali, dziakujem, nadrukujem u nastupnym numary, pišycie čaściej.

Zarecki. Piśmo atrymali, skarystajem; praz hazetu padadziom paradu.

Patrebič. Atrymali, dziakujem, skarystajem, premiju wyšlem, pišycie čaściej.

I. K. z Machałaū. Pryhožaje Wašaje piśmo atrymali, biblijatečku sastawim i pawiadomim Was ab košcie pierasyłki.

Prysutny. Ab dziejnaści hurtka atrymali, skarystajem.

J. P. Dziakujem, skarystajem, pišycie čaściej.

Lawon Žalejka. Atrymali, drukujem, pišycie, niezabywajcie nas.

Jotraūski. Piśmo Wašaje drukujem, pišycie ab žyćci ahułam u Wašaj wakolicy.

**UWAHA! UWAHA!**

Uniadzielu 26 studnia siol. u zal Bieł. Instytutu Haspadarki i Kultury pry Zawalnaj wul. Nr. 1—1 Staršynia Instytutu Ks. W. HADLEŪSKI pračytaje publičnuju lekcyju na temu

**„Pačatki historyi Biełarusi".**

Paśla lekcyi charawyja śpiewy biełaruskich narodnych i kaladnich pieśniaū i deklamacyi. Pačatak roūna a hadz. 17-aj. Uchod wolny i biaspłatny

*Urad Wilenskaha Addziełu BIHiK*

KATALOH biełaruskich knižak na žadańnie wysyłajecca DARMA.

Adrasawać: Biełaruskaja Kniharnia «PAHONIA» Wilnia, Zawalnaja 1—1.

Dr. Stanisłaū Hrynkiewič

# Aświeta

6)

(*Ab Narodnym Uniwersytecie i inšych sposabach aświetnaje pracy*).

### 11. Arhanizacyi moładzi.

Zaležna ad charaktaru arhanizacyi budziem bačyć taki ci inšy sposab i spróby realizawać prablemy aświety. Najčaściej ramy arhanizacyi dawoli šyrokija, tak što nahladajucca ū ich imknieńnie pa miery mahčymaści abchapić usie haliny žyćcia. Inšyja adnak majuć na ūwiecie wyklučna adnu staranu žyćcia, prykładam wyklučna spartyūnyja arhanizacyi, abo majučyja naūwiecie tolki krajaznaūstwa ci daśledywańnie historyi ci jašče niešta inšaje.

U biełaruskich umowach pad Polščaju, jak heta nia dziūna, dahetul nia majem my swaje arhanizacyi moładzi. Ale! Sapraūdy niwodnaje arhanizacyi! Na terytoryi biełaruskaj majem zatoje šmat arhanizacyjaū moładzi, da jakich należać dziaūčaty i chłapcy biełarusy, adnak heta arhanizacyi čužyja. Jany nia ūmieli zakranuć nutra, dušy swaich siabroū. I niama čaho dziwicca, inakš jano było i niemahčyma.

A jakija wialikija i bahatyja mahčymaści pierad pracaju ū arhanizacyjach moładzi. Wielmi časta wiaduć jany čytalni, kursy hramaty, bibliateki, ahułam akcyju aświetnuju ū najšyrejšym sensie hetaha słowa.

Sprawa henaja nastolki balučaja i ważnaja, što jaje treba ū nas zaūsiody trymać na paradku dnia.

Chaj skaz „moładź—našaja budučyna" i padobnyja jamu hučać mo' krychu adnastajna, praūda ū ich ūsio-ž wialikaja. Razumiejem i wiedajem, što šlach žyćciowy adzinki—heta praciažnaja linija, jakaja moža padymacca ci spuskacca stromka z horki, zaūsiody adnak trywaje biez pierarywu da samaha kanca, da śmierci čaławieka. Dyk treba ūzhadowywać charaktar adzinki zmałku. Charaktar uzhadowywajecca ū siamji, škole, u sužyćci z rawieśnikami, supracoūnikami chatnimi, i niachatnimi, a značycca wiaskowymi susiedziami u swajoj hminie, carkwie, kaściele i h. Uzhadawańnie takoje realizujecca na ūłońni swajej arhanizacyi. Na štodzień dyk my i nia bačym tych wializarnych śledamkaū, jakija pakidaje pa sabie arhanizacyja. Tolki nie zabywajma, što kab acanić wyšyniu hary, ci charastwo cudoūnaje architektury ci nikatorych radoū malarstwa — treba mieć perspektywu, treba krychu adstupicca i pahladzieć zdalok. Što moža kazać ab bitwie ūčaśnik jaje? Jon bačyū malusieńkuju tolki z jaje častku i wyabražaje z hetaha ab celaści. Hetak i z pracaju nacyjanalnaju i z pracaju arhanizacyjnaju ū mienšym ci zusim maleńkim maštabie. Ci z efektu postupu i zdabyčaū biełaruskich, skažam u parfienaūskaj ci inšaj wołaści, možna asudzić, što zroblena ahułam dziela biełaruskaje sprawy?! Jasna, što nie!...

Dyk arhanizacyja daje šmatlikija karyści. Pakažam tolki na adno. U swajoj arhanizacyi možna padtrymać charaktar, nie dapuścić da demaralizacyi, zahartawać, baranić ad tych razjadajučych dziejańniaū, ab jakich čujem my siańnia na našaj wioscy. Što čaławiek słaby, wiedajem my dobra. Wielmi časta treba jaho paddziaržać, jon potym adducaje a siańnia woś treba jamu pamahčy, kali jon jašče nadta kwoły.

Arhanizacyja prywučaje canić hramadzkuju, publičnuju apiniju, šukajučy pry hetym u joj hłybiejšych, ważniejšych staron. Arhanizacyja ūzhadowywaje hramadzkaje sumleńnie.

Nia dumaju tutaka pisać ab usich staranach pracy arhanizacyjaū moładzi. Chacieū-by tolki padčyrknuć z naciskam, što adsutnaść ich u Zachodniaj Biełarusi—heta žywaja i balučaja rana, jakoje pakinuć biazdziejna my nia možam.

* * *

Z pytańniem arhanizacyjaū moładzi stulna złučana *fizyčnaje uzhadawańnie narodu.* Siańniašni spartowy „uzdojm" zakranuū uwieś świet. Da biełaruskaje wioski dachodzić tolki słaboje recha ab roznych dužańniach, dahonkach i h. d. Henyja konkursy źjaūlajucca tolki adnoju staranoju sportu i nie ab takim sporcie treba nam rupicca. Sport tady tolki budzie karysny, kali budzie masawym, kali zhurtuje kala siabie wialikija masy ludziej, jak dziejnych učaśnikaū. Tolki hetki sport karysny, zdarowy. Jon zakraplaje hramadzkija instynktv ludziej.

Praca nad sportam najbolš patrebnaja i najbujniej raźwiwajecca siarod moładzi. Moładź zrazumieūšy i należna acaniūšy značeńnie sportu padtrymaje jahony razwoj budučy sama ūžo ū śpiełym wieku. Dyk pačynać hetkuju pracu možna tolki z moładździu i šyroka jaje razhortywajučy.

Dasiulešnija spróby biełaruskija ū henaj halinie nie pakinuli wialikšych śledamkaū. Jość ci była prynamsia na biełaruskaj emihracyi arhanizacyja „Sokała," tolki nažal niejak dahetul nia pryščapiłaś henaja pryhožaja ideja na wioscy. Byli spróby naładzić pracu ū formie skaūtingu („hajsaki" pawodle prapazycyi hram. Kazłoūskaha). Jaki los henych sprobaū, nia wiedaju.

Sučasny kryzys nia tolki ekanamičny, a šmat za jaho ważniejšy — kryzys kulturny paklikaje na paradak dnia formy žyćcia masawaha, byccam tolki ū masie možna znajści adkaz i apraūdańnie ūsiaho, ab čym čaławiek latucić i da čaho imknieeca. Prykłady swajerodnaje „masawaści" nahladajem i ū balšawikoū u Rasiei i ū fašystych u Italii i ū hitleroūskaj Niamieččynie. I nahladajučy za razwojem pamianionych formaū u roznych narodaū, chacia i bačym kult adzinak, adnak žyćcio trymajecca tam na arhanizacyjach najšyrejšych, jakija imknucca zachapić u sferu swajho dziejańnia na't małoje dzicia.

Jość u hetym wialikaja nawuka i nam nia treba zabywacca wučycca z faktaū, jakija nam nakidywaje historyja. *Budawać ad nizoū jaknajšyrej i pačynać ad moładzi.* Moładź maje cikawańni šmatlikija i ūniwersalnyja, dyk i arhanizacyi i dziela moładzi chaj buduć hetkimi uniwersalnymi.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ū Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič